Источник: "Звязда" - 2013-02-15

# ПАКУЛЬ БАТАНІКІ АДПАЧЫВАЮЦЬ...



**У Мінскім батанічным садзе ідзе падрыхтоўка да Другога фестывалю-конкурсу снежна-лядовых скульптур «Казачны сад — 2013», у якім будуць удзельнічаць прафесійныя скульптары. Нягледзячы на капрызы надвор'я, арганізатары ўсё ж адважыліся правесці гэты незвычайны пленэр і абяцаюць наведнікам відовішчную экспазіцыю — яна адкрыецца ўжо заўтра. Лёд для будучых фігур дастаўлены з аднаго са сталічных халадакамбінатаў. Акрамя прафесійных скульптараў, у конкурсе бяруць удзел навучэнцы мастацкіх каледжаў імя Глебава і Ахрэмчыка, студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў. Каля лядовай лютаўскай выставы арганізатары запланавалі цікавую забаўляльную праграму з фаер-шоу, катаннем на конях, квадрацыклах і паветраным шары.**





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

"Звязда". Пакуль батанікі адпачываюць…